*В.І.Саітава, дацэнт*

# ФОТАДАКУМЕНТЫ ЯК АБ’ЕКТ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

Паняцце “краязнаўчая фатаграфія” выкарыстоўваецца ў адносінах да фотаздымкаў, прысвечаных населеным пунктам і рэгіёнам краін. Славу беларускай краязнаўчай фатаграфіі прынеслі выдатныя фотамастакі розных пакаленняў, такія як Ян Балзункевіч, Ян Булгак, Юзэф Ядкоўскі, Міхась Раманюк, Мірон Шчудло і інш. У сучасных публікацыях можна заўважыць думку аб наступленні ў Беларусі “культа краязнаўчай фатаграфіі”. Выдатна сказаў на адкрыцці фотавыставы ў Гальшанах вядомы фотамастак Уладзімір Багданаў: “...паколькі культура ў цэлым – гэта гістарычна складзены ўзровень развіцця грамадства, то давайце разам паглядзім, на якім узроўні мы знаходзімся зараз” [1]. Менавіта магчымасць “глядзець разам” вачамі фатографа і ўласнымі памнажае моц уздзеяння фатаграфій, асабліва прысвечаных родным мясцінам.

Краязнаўчая фатаграфія высока запатрабавана ў сучасным грамадстве. Даследчыкі падкрэсліваюць неацэннае значэнне краязнаўчых фатаграфій для справы рэстаўрацыі гісторыка-культурных помнікаў, атрымання ўяўленняў аб страчаных аб’ектах, аб змяненнях прыроднага ландшафту і інш. Для турызму яны эфектыўны элемент інфармацыйна-рэкламнага ўздзеяння, адлюстравання унікальнасці рэгіёнаў. У друку – гэта выдатны ілюстрацыйны матэрыял.

Фатаграфіі атрымалі шырокае распаўсюджанне ва ўстановах, функцыямі якіх з'яўляюцца фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў, навуковая, інфармацыйная, асветніцкая дзейнасць. Яны складаюць важную частку архіўных і музейных фондаў; тут назапашаны вопыт збірання і вывучэння фотаздымкаў, выкарыстання іх у навуковых даследаваннях і ў папулярызацыі краязнаўчых ведаў [2]. Натуральна, што фотадакументы ўвайшлі і ў склад інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. На сучасным этапе, акрамя фотаальбомаў і розных выданняў, якія змяшчаюць фатаграфіі ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, бібліятэкам мэтазгодна больш увагі звярнуць на збіранне непасрэдна краязнаўчых фатаграфій. Гэта адпавядае перспектыўнай тэндэнцыі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

павелічэння ў краязнаўчых фондах дакументаў, розных па знакавай прыродзе інфармацыі і матэрыяльных носьбітах. Бібліятэкі працуюць зараз з фотадакументамі даволі актыўна. Найбольшае распаўсюджанне атрымалі фотавыставы “Край сёння”, “Мінулае і сучаснасць краю”, “Помнікі і памятныя мясціны краю”, па тэмах прыроды і экалогіі, фотагалерэі і персанальныя выставы майстроў краязнаўчай фатаграфіі і інш. Выставы з'яўляюцца арганічным элементам шматлікіх масавых мерапрыемстваў краязнаўчага характару. Друкаваная фотапрадукцыя адлюстроўваецца ў бягучых і рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможніках, у фактаграфічных краязнаўчых базах даных. Фонды папаўняюцца выданнямі з краязнаўчымі фотаздымкамі, а часам ствараюцца фонды сабраных краязнаўчых фотаздымкаў. Выданні з фотаілюстрацыямі адлюстроўваюцца ў краязнаўчых каталогах, картатэках, базах даных паводле зместу.

Аднак работа бібліятэк з краязнаўчымі фотадакументамі мала распрацавана ў тэарэтыка-метадычным аспекце. Адзінай працай, дзе падкрэслена важнасць фотаздымкаў, былі метадычныя рэкамендацыі НББ “Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк” [3]. У парадах па стварэнні дакументнай і фактаграфічнай базы “Народны архіў” адзначаліся і фотаздымкі, якія рэкамендавалася збіраць разам з пісьмамі, біяграфіямі, успамінамі і асабістымі дакументамі ў асобныя папкі пад назвай “Радавод”. Складальнікі дапаможніка далі кароткія парады па апісанні фотаздымкаў і ахарактарызавалі значэнне і методыку картатэкі фотаздымкаў жыхароў і ўраджэнцаў краю [3, с. 60–61]. Некаторыя пытанні выяўлення, адбору і вывучэння фотадакументаў у бібліятэках яшчэ не даследаваліся ці асветлены недастаткова. Іх разгляд дазволіць лепш асэнсаваць працэсы і метадычныя асаблівасці работы з фотадакументамі як у практычнай, так і ў даследчай краязнаўчай дзейнасці ЦБС і іншых бібліятэк.

**Выяўленне фотадакументаў**. Асноўнымі групамі выданняў, па якіх магчыма шукаць фатаграфіі аб рэгіёнах, з'яўляюцца фотаальбомы, даведачныя, навуковыя і навукова-папулярныя выданні, мясцовы перыядычны друк, электронныя краязнаўчыя выданні, бягучыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Краязнаўчыя фотаальбомы, камплекты паштовак выяўляюцца з дапамогай матэрыялаў выдавецка-кнігагандлёвай бібліяграфіі, па “Летапісе выяўленчага мастацтва” і паказальніках “Новая літаратура аб вобласці”. У “Летапісе выяўленчага мастацтва” адлюстроўваюцца

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

фотаілюстрацыі мастацкіх твораў краязнаўчага характару, апублікаваныя ў беларускіх перыядычных выданнях. У паказальніках “Новая літаратура аб вобласці” і іншых паказальніках абласных бібліятэк адлюстроўваюцца апублікаваныя фатаграфіі.

Заслугоўвае ўвагі абследаванне неперыядычных і перыядычных выданняў, пачынаючы з другой паловы XIX ст., напрыклад навуковых часопісаў “Kwartalnik historyczny”, “Litwa i Ruś”, “Ateneum Wileński”, “Ziemia Lidska”, “Наш край” і іншых, газет даваеннага часу, мемуараў, навуковых і папулярных выданняў, прысвечаных комплекснаму апісанню рэгіёнаў і населеных пунктаў і інш. У наш час неабходна адзначыць багаты фотаматэрыял у гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў “Памяць” і ў іншых выданнях гэтага папулярнага зараз жанру, у кнігах, прысвечаных асобным населеным пунктам, у тым ліку вёскам.

Каштоўнымі крыніцамі для пошуку з'яўляюцца публікацыі збораў выдатных калекцыянераў фотадакументаў. Так, у выданні “Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej” Р.Афтаназі прадстаўлены унікальныя фотаздымкі канца XIX – пачатку XX ст. сядзіб і маёнткаў на тэрыторыі Беларусі. Выйшлі падобныя кнігі ў Беларусі, пры- свечаныя сядзібам Міншчыны і Берасцейшчыны. Выдатна афармленыя, яны змяшчаюць рэдкія і каштоўныя фотаздымкі. Збіранне ў публічных бібліятэках звестак пра шляхецкія сядзібы, роды і фатаграфій, прысвечаных ім, – значны кірунак краязнаўчай даследчай працы. Магчыма папоўніць веды аб эканоміцы рэгіёнаў, у чым уладальнікі маёнткаў займалі вядучае месца на працягу доўгага гістарычнага перыяду. Сядзібы і палацы, іх унутранае ўбранства з'яўляюцца неад’емнымі элементамі матэрыяльнай культуры беларускага народа. Для пошуку фотаздымкаў мінулага часу ў бібліятэках магчыма звязацца з фотакалекцыянерамі, перш за ўсё мясцовымі, паспрабаваць весці пошук нашчадкаў былых настаўнікаў, святароў, служачых, памешчыкаў. Вядома, што гэта складаны, даследчы ўзровень працы, але многія сучасныя бібліятэкі ўжо маюць вопыт краязнаўчых даследаванняў рознай тэматычнай накіраванасці.

Заслугоўвае ўвагі праблема ўзаемадзеяння бібліятэк з установамі – фондатрымальнікамі фотадакументаў. Гэта перш за ўсё мясцовыя музеі і архівы, але таксама і цэнтральныя, у тым ліку Дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (г.Дзяржынск). У гэтым архіве захоўваюцца фотаздымкі з 70-х гг. XIX ст. да цяперашняга часу [2]. Збор вельмі разнастайны па змесце, ёсць фонд па гісторыі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Мінска, Нясвіжа, Барысава, Вілейкі, Заслаўя, Кобрына, Гомеля, Пінска, Гродна, Віцебска, Магілёва і іншых гарадоў. Супрацоўніцтва з музеямі і архівамі паспрыяе не толькі павелічэнню гэтага рэсурсу ў бібліятэках, але і паглыбленню краязнаўчых ведаў, пашырэнню формаў іх папулярызацыі.

Краязнаўчыя фатаграфіі неабмежавана шырока прадстаўлены ў электронных інфармацыйных рэсурсах, і бібліятэкі маюць магчымасць іх шырока выкарыстоўваць. Існуюць сайты, мэтанакіравана створаныя як краязнаўчыя. Гэта сайты гарадоў, падрыхтаваныя краязнаўцамі-аматарамі, краязнаўчымі таварыствамі, музеямі, універсітэтамі, выдаўцамі края- знаўчых газет, часопісаў і зборнікаў і інш. Фотаматэрыялы прадстаўлены на сайтах органаў рэгіянальнай улады, прадпрыемстваў і ўстаноў, турыстычных фірмаў. У інтэрнеце выстаўляюцца і асобныя фотавыданні, напрыклад кніга лідскіх краязнаўцаў Л.Лаўрэша і У.Круцікава “Ліда на старых малюнках, паштоўках, фотаздымках” мае і электронны адрас. Сайты, прысвечаныя населеным пунктам, маюць раздзелы “Фотаальбом”, “Фотагалерэя”, дзе змяшчаюцца фотаздымкі гістарычных і культурных помнікаў, памятных мясцін, знакамітых людзей з тэкставымі даведкамі. Да ліку лепшых можа быць аднесены краязнаўчы даведнік “Radzima. org.”, які змяшчае графічную і тэкставую інфармацыю пра помнікі гісторыі, культуры і архітэктуры ўсіх рэгіёнаў Беларусі, якія захаваліся ці існавалі да 1939 г. Разам з тым сайт патрабуе значнага папаўнення, пэўным арыенцірам для яго развіцця могуць быць вопыт і матэрыялы Р.Афтаназі. На жаль, не даюцца бібліяграфічныя спасылкі на крыніцы інфармацыі.

У бібліятэках важна весці маніторынг сайтаў, найбольш значных з пункту гледжання адлюстраваных фотадакументаў і суправаджальнай тэкставай інфармацыі, прадастаўляць карыстальнікам іх інтэрнэт-адрасы.

**Вывучэнне фотадакументаў** вядзецца з мэтай устанавіць невядомыя ці няпэўныя даныя фатаграфій, сабраных у бібліятэцы. Вывучэнне фотадакументаў пачынаецца на стадыі іх адбору і накіравана на атрыбуцыю адлюстраванай інфармацыі, а таксама высвятленне гістарычнага кантэксту. Вопыт і методыку вывучэння і апісання фотадакументаў у музеях можна ў пэўнай ступені выкарыстаць і ў бібліятэках [2]. Прапануем наступную паслядоўнасць дзеянняў бібліятэкара-бібліёграфа пры вывучэнні фотаздымкаў: устанаўленне важнейшых знешніх характарыстык

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

фотаздымка, гэта, у прыватнасці, яго віду (фатаграфія, фотаальбом, негатыў, дыяпазітыў і інш.), жанру (парны ці групавы партрэт, фатаграфія сюжэтная, відавая, пейзажная); вызначэнне назвы, крыніцы і даты паступлення; устанаўленне сувязі фотаздымка з іншымі дакументнымі краязнаўчымі рэсурсамі. Магчымы і дадатковыя аперацыі, накіраваныя на больш глыбокую ідэнтыфікацыю фотадакумента, напрыклад выяўленне памеру, тэхнікі выканання, ступені захаванасці і інш.

Бібліяграфічнае апісанне выконваецца паводле дзеючых стандартаў і правіл для асобных кампанентаў ДБА і бібліяграфічных дапаможнікаў. У час правядзення краязнаўчых даследаванняў узнікае неабходнасць апісання набытых фотаздымкаў з элементамі навуковай характарыстыкі. Такое апісанне спалучае даныя атрыбуцыі фота, яго знешняга выгляду, характарыстыкі сюжэта і кампазіцыі выявы; звязвае фота з іншымі дакументнымі рэсурсамі і становіцца унікальным кампанентам краязнаўчых ведаў, якія, магчыма, нельга атрымаць па іншых крыніцах. Можна параіць бібліятэкарам-бібліёграфам для апісання фотавыявы зыходзіць са зместу краязнаўчых ведаў, у комплекс якіх будзе ўключаны канкрэтны фотаздымак, і характарызавць такім чынам, каб дапоўніць ці падкрэсліць адметнасці часу, падзей, мясцовых традыцый і ўкладу жыцця. У прыватнасці, пры апісанні партрэтных фатаграфій можна адзначыць, у якім адзенні асобы, з якімі ўзнагародамі, характэрнымі для часу (мясцовасці) упрыгожваннямі, на якім фоне (каля пэўнага дома, у кабінеце і г.д.). Варта ўказаць і тып партрэта (галава, у рост, анфас і г.д.), паколькі такая інфармацыя можа быць карыснай для краязнаўцаў, якія вядуць пошук дакладных звестак аб знешнім выглядзе пэўных асоб. Пры апісанні сюжэтных і відавых фотаздымкаў пажадана адлюстраваць важнейшыя элементы кампазіцыі, інтэр’ера памяшканняў, асабліва характэрныя ці, наадварот, не тыповыя для дадзенай мясцовасці. Прыметы часу захоўваюць і зробленыя на фатаграфіі надпісы, штампы, знакі, таму яны таксама павінны ўлічвацца бібліятэкарам-бібліёграфам пры апісанні гэтых дакументаў. Калі запісы зроблены на замежнай мове, пажадана ў апісанні прывесці запіс арыгінала з дакладным перакладам на беларускую мову.

Важным элементам бібліяграфічнага і навуковага апісанняў з'яўляецца назва фотаздымка. Фотадакумент можа мець аўтарскую назву, звесткі, адзначаныя сфатаграфанымі персонамі, а таксама

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўказаныя даты і месца фотаздымкі. Пры адсутнасці даных інфармацыю трэба шукаць іншымі шляхамі, напрыклад, звяртацца да сваякоў ці сведак, да навуковых і іншых прац, кансультавацца з краязнаўцамі. У назвах партрэтных фота неабходна ўказваць прозвішча, імя, імя па бацьку адлюстраванай асобы і звесткі, важныя для краязнаўчага аспекту (пасада, прафесія, тытул, месца жыхарства, удзел у пэўнай падзеі.); у назве парнага і групавога партрэта пералічыць усіх асоб, але на першым месцы тых, якія звязаны з дадзеным краем. У назвах сюжэтных, відавых, пейзажных фотадакументаў, калі яны даюцца бібліятэкарам-бібліёграфам, можа спачатку вызначацца агульны змест, затым важныя дэталі.

Пры адсутнасці дакладных звестак пра час і месца фотаздымкі пажадана ўстанавіць іх прыблізна. Цікавым не толькі для атрыбуцыі канкрэтнага фота, але і для вывучэння развіцця мясцовага фотамастацтва з'яўляецца пошук звестак пра фатографаў, месцазнаходжанне і ўладальнікаў фотаатэлье. Трэба адзначыць, што ў "Тыпавой схеме класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь" няма рубрыкі, прысвечанай рэгіянальнаму фотамастацтву. Гэты кірунак даследаванняў даступны бібліятэкам і можа прынесці пэўны плён у справе ўзбагачэння краязнаўчых ведаў.

---

1. *Налівайка Л.* Выстава як хіт-парад // Культура. – 2002. – 18 – 24 мая (№ 19). – С.7.

2. *Варанкова І.Ю.* Навуковая апрацоўка фотадакументаў // Музейныя сшыткі. Навуковая апрацоўка музейных прадметаў: пісьмовыя і фотадакументальныя помнікі: навук.-метад. зборнік. – Мн., 1999. – С.48 – 52.

3. *Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк: метад. рэк. / НББ; склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Сокал; рэд. І.А.Прылішч, Р.М.Чыгірова. – Мн., 1994. – 102 с.

4. *Грыневіч А.* Беларускаму дзяржаўнаму архіву кінафотафонадакументаў – 60 гадоў // Архівы і справодства. – 2001. – № 2. – С. 76–80.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ